Уже сегодня ведущие мировые производители программного обеспечения Google и Microsoft предоставляют ряд сервисов, адаптированных специально под нужды образовательных учреждений. Использование «GoogleApps для учебных заведений» и «Microsof Live@edu» при подготовке библиотечных специалистов с высшим образованием сегодня позволит обеспечить библиотеки квалифицированными специалистами, готовыми к внедрению любых инновационных информационных технологий в их практическую деятельность завтра [2].


1. *Аветисов М. А.* Малая облачная библиотечно-информационная система [Электронный ресурс] / М. А. Аветисов, В. И. Стеллецкий. – Режим доступа: http://gpntb.ru/win/inter-events/crimea2011/disk/048.pdf.

2. *Алексеева, Т. В.* Использование облачных технологий для организации обучающего информационного пространства / Т. В. Алексеева // Информационно-коммуникационное пространство и человек: материалы II международной научно-практической конференции (Пенза, 15–16 апр. 2012 г.) / [редкол.: С. Ю. Девятых и др.]. – Пенза, 2012.– С. 77–80.

3. Библиотека будущего: 10 трендов развития [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://ria.ru/culture/20120419/630032745.html.

4. ООО Национальный центр поддержки и разработки. Облачные вычисления (CloudComputing). Архитектура системы и модели [Электронный ресурс] / ООО Национальный центр поддержки и разработки. – Режим доступа: http://netconfigure.net/index.php/ru/services/it-cloud/oblachnye-vychisleniya-cloud-computing.

5. *Федоров, А.* Облачные решения для библиотек [Электронный ресурс] / А. Федоров. – Режим доступа : http://ideafor.info/?p=4506.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ю. А. Пераверзева,** *дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, кандыдат педагагічных навук, дацэнт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

# ПРАФЕСІЙНАЕ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЕ Ў БІБЛІЯТЭЧНА-ІНФАРМАЦЫЙНАЙ СФЕРЫ: АРГАНІЗАЦЫЙНА-ЗМЯСТОЎНЫ АСПЕКТ

Ва ўмовах інфарматызацыі грамадства прафесійнае ўзаемадзеянне бібліятэчных спецыялістаў набывае новы змест, абумоўлены зменай падыходаў да развіцця бібліятэчна-інфарма-

цыйных тэхналогій пад уплывам Web 2.0, а менавіта выкарыстаннем гарызантальнай мадэлі ўзаемадзеяння з карыстальнікамі, заснаванай на гуманістычных пазіцыях агульначалавечага характару, прымяненнем эфектыўных тэхналогій маркетынгавых камунікацый, уключэннем у штодзённую бібліятэчную працу рознага кшталту сервісаў і падкастаў і інш. [5; 6]. Гэта сведчыць аб тым, што трансфармуецца сістэма прафесійнага ўзаемадзеяння бібліятэкараў, у якой, у сваю чаргу, фарміруюцца і распаўсюджваюцца прафесійныя і асобасныя веды, вопыт, выпрацоўваюцца інавацыйныя арганізацыйна-педагагічныя траекторыі навучання будучых спецыялістаў, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі наяўных супрацоўнікаў бібліятэк.

Па меркаванні экспертаў, прафесійная камунікацыя можа здзяйсняцца ў выглядзе афіцыйных (фармальная камунікацыя) і неафіцыйных (нефармальная камунікацыя) кантактаў [1]. А сярод яе кампанентаў мэтазгодна вылучаць традыцыйныя і электронныя формы і метады прафесійнага ўзаемадзеяння.

Неабходна адзначыць, што асноўнай тэндэнцыяй развіцця форм і метадаў прафесійнага ўзаемадзеяння выступае ўдасканаленне спектра бібліятэчна-інфармацыйных прадуктаў і паслуг па змесце, формах, тэхналогіях у адпаведнасці з запытамі соцыуму. Таму неабходна сфарміраваць гатоўнасць бібліятэчнага спецыяліста рэагаваць на зменлівыя арыенціры яго прафесійнай дзейнасці, што можна ажыццяўляць на ўзроўнях рэгламентаванай і нерэгламентаванай дадатковай бібліятэчнай адукацыі.

У сістэме дадатковай прафесійнай адукацыі бібліятэкараў працуе шэраг устаноў адукацыі (ДУА «Інстытут культуры Беларусі», РІВШ, Рэспубліканскі інстытут інавацыйных тэхналогій БНТУ), якія распрацоўваюць спецыяльныя адукацыйныя праграмы для спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы («Мадэрнізацыя бібліятэчна-інфармацыйнай прасторы сучаснай бібліятэкі», «Менеджмент якасці», «Інфармацыйнае і праграмнае забеспячэнне прафесійнай дзейнасці (бібліятэчная справа)» і г. д.) і рэалізуюць іх у тандэме з самымі буйнымі бібліятэкамі краіны (НББ, ФБ БДУ, НБ БНТУ) і Беларускай бібліятэчнай асацыяцыяй.

На сённяшні момант склалася пэўная класіфікацыя традыцыйных і электронных форм прафесійнага ўзаемадзеяння. Так, традыцыйнае прафесійнае ўзаемадзеянне ажыццяўляецца апасродкавана праз прафесійны друк, непасрэдна на навуковых фо-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

румах, вытворча-практычных семінарах, курсах павышэння кваліфікацыі, пры асобасным абмеркаванні пэўных вытворчых і іншых задач.

Прафесійнае ўзаемадзеянне з выкарыстаннем электронных камунікацый абапіраецца на набор інструментальных сродкаў для дыстанцыйнага доступу да інфармацыі і для яе перадачы: ад электронных публікацый да кантактаў праз электронную пошту, чаты, форумы, сацыяльныя сервісы з іх магчымасцямі калектыўнага аўтарства, праўкі, каменціравання і абмену каштоўнымі спасылкамі [6, с. 194–195].

Пры гэтым, якія б формы прафесійнага ўзаемадзеяння не дамінавалі ў калектыве на гарызантальным і вертыкальным узроўнях кіравання бібліятэкай, яны выклікаюць дзеянне ці бяздзеянне, якое ўплывае на наступствы выканання тых ці іншых вытворчых функцый і аперацый. Дзеянне ўзнікае пад уплывам нейкага стымулу, а наступствам можа быць узнагароджванне за працу. Таму, незалежна ад відаў прафесійных зносінаў, распаўсюджаных у бібліятэчным калектыве, адбываецца ўздзеянне на суб'екта прафесійнай дзейнасці па трох напрамках – працэс, вынік, крыніцы фарміравання новых якасцяў і прафесійна-асобасных кампетэнцый бібліятэкара-бібліёграфа.

Для спецыялістаў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы характэрны аперантныя паводзіны ці дзеянні, накіраваныя на атрыманне чакаемага выніку, у аснове якога знаходзіцца ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва індывідаў у працэсе камунікацыі. Сучасная бібліятэчна-інфармацыйная інфраструктура садзейнічае развіццю навуковага (праца над навуковымі тэмамі, артыкуламі, справаздачамі), вытворча-практычнага (прыняцце рашэнняў, якія будуць садзейнічаць аптымізацыі пэўных цыклаў, працэсаў і аперацый), грамадска-карыснага ўзаемадзеяння паміж кіраўнікамі і бібліятэчнымі спецыялістамі.

Эфектыўнасць прафесійнага ўзаемадзеяння залежыць ад хуткасці ўваходжання супрацоўніка ў калектыў. Асабліва гэта датычыцца маладых спецыялістаў, якія з'яўляюцца носьбітамі каштоўнасцяў, набытымі ў сям'і, у зносінах з сябрамі і г. д. Кіраўніку патрэбна паўплываць на такога супрацоўніка, зрабіць захады па інтэграцыі існуючай у яго сістэмы каштоўнасцяў з нормамі карпаратыўнай культуры, якая ёсць у бібліятэцы.

Відавочна, што на працэс усталявання прафесійных адносінаў аказвае ўплыў ступень сацыялізаванасці спецыяліста ў ка-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

лектыве. Сучасныя канцэпцыі кіравання персаналам пабудаваны такім чынам, каб спецыяліст мог стварыць вакол сябе пэўнае арганізацыйна-культурнае асяроддзе з улікам уласных ментальных каштоўнасцяў [3, с. 64]. Пры гэтым новыя супрацоўнікі ў працэсе прафесійнай сацыялізацыі павінны ўспрыняць устаноўкі і нормы, неабходныя для падключэння да рэалізацыі місіі арганізацыі. Для гэтага HR-менеджары і андрагогі рэкамендуюць выкарыстоўваць арганізацыйныя формы навучання і, у першую чаргу, педагагічнае праектаванне, якое ў кожнай асобнай прафесійнай сітуацыі скіравана на дасягненне пажаданых змяненняў пры апоры на веды і кампетэнцыі з улікам канкрэтнага зместу адукацыйнага мерапрыемства і яго мэтавай аўдыторыі [2, с. 44]. Такім чынам можна дасягнуць кіравання змяненнямі, удасканалення тэхналагічнай арганізацыі працы, абгрунтаванага падыходу да выбару прынцыпаў развіцця бібліятэкі.

На дадзены момант для бібліятэкараў своечасовай прафесійнай праблематыкай з'яўляецца культура арганізацыі разумовай дзейнасці (фарміраванне даследчай кампетэнтнасці, уменняў арганізацыі разумовай працы, пераадолення інфармацыйных перагрузак, авалоданне мнематэхнікай і эфектыўнымі спосабамі падрыхтоўкі да адукацыйных мерапрыемстваў у межах сістэмы ДПА і інш.), а таксама супрацоўніцтва ва ўмовах «інфармацыйна-тэхналагічнай парадыгмы развіцця грамадства, якая прадугледжвае накіраванасць тэхналогій на апрацоўку інфармацыі, усеахопнасць эфектаў новых тэхналогій, сеткавую логіку сукупнасці адносінаў, пры якіх выкарыстоўваюцца найноўшыя інфармацыйныя тэхналогіі і г. д.» [Цыт. па: 4, с.110]. З гэтай нагоды трэба адзначыць, што найбольш папулярнымі тэмамі, якія абмяркоўваюць бібліятэкары ў блогах з'яўляюцца: інаватыка ў бібліятэках розных тыпаў і відаў, нарматыўнае поле прафесійнай дзейнасці, віртуальнае бібліятэчна-інфармацыйнае абслугоўванне, арганізацыя навучання спецыялістаў розных катэгорый і прафесійных груп, фарміраванне інфармацыйнай культуры карыстальнікаў і шмат іншых (аўтарскі блог Андрэя Фёдарава «Идеи простых решений», «Копающаяся в методиках», «Методистик@»).

Такім чынам, прафесійнае ўзаемадзеянне садзейнічае:

– фарміраванню бібліятэчна-інфармацыйнага асяроддзя з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, якія сістэмна ўздзейнічаюць на ўсіх удзельнікаў працэсу біб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ліятэчнага абслугоўвання, спрыяюць стварэнню лакальнай інфармацыйнай прасторы, дзе суб'екты прафесійнай дзейнасці і карыстальнікі могуць атрымаць метадычную і інфармацыйную падтрымку, працаваць ў дыялогавым рэжыме;

– фарміраванню цэласнага бібліятэчнага калектыву, каманды аднадумцаў, якая можа якасна выконваць пастаўленыя мэты і задачы незалежна ад прыналежнасці да прафесійнай групы і пасадавай катэгорыі супрацоўніка;

– фарміраванню лаяльнасці ў калектыве (паміж кіраўнікамі, вопытнымі работнікамі і тымі спецыялістамі, што толькі пачынаюць свой працоўны шлях). Бібліятэчны спецыяліст як суб'ект дзейнасці павінен асэнсавана ставіцца да працэсу стварэння індывідуальнага вопыту, які ўключае ў сябе не толькі набор выкарыстоўваемых метадычных прыёмаў, але і абгрунтаваны адбор аптымальных сродкаў прафесійнай дзейнасці, заснаваных на асабістай практыцы;

– дасягненню высокіх паказчыкаў бібліятэчнай вытворчасці, калі выкананне функцыянальных абавязкаў кожным супрацоўнікам вядзе да атрымання запланаваных вынікаў. Бібліятэкары сёння працуюць ва ўмовах адначасовага прымянення традыцыйных методык і тэхнік і тэхналагічных, сервісных, прадуктыўных інавацыйных рашэнняў, неабходных для якаснага бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў.


1. *Богданова, И. Ф.* Онлайновое пространство научных коммуникаций / И. Ф. Богданова // Социология науки и технологий. – 2010. – Т.1, № 1. – С. 145–161.

2. Интернет-обучение: технологии педагогического дизайна / М. В. Моисеева [и др.]; под ред. М. В. Моисеевой. – М. : Камерон, 2004. – 223 с.

3. Новые технологии управления персоналом / Г. Н. Сартан [и др.]. – СПб. : Речь, 2003. – 236 с. – (Психологический практикум).

4. *Терещенко, О. В.* Проблемы подготовки специалиста в информационном обществе / О. В. Терещенко // Менеджмент вузовских библиотек. Роль библиотеки университета в формировании информационной культуры специалиста XXI века : материалы XII Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 12–14 окт. 2011 г. / Белорус. библ. ассоц., Белорус. гос. ун-т, Фундам. б-ка ; редкол.: П. М. Лапо (отв. ред.) [и др.] ; под науч. ред. А. В. Рубанова. – Минск : Изд. центр БГУ, 2012. – С. 109–116.

5. *Шрайберг, Я. Л.* Электронная книга, будущее библиотеки и общественное сознание: попытка осмысления и предвидения : ежегодный


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

доклад Конференции «Крым», год 2013 / Я. Л. Шрайберг. – М. : ГПНТБ России, 2013. – 72 с.

6. *Юрик, И. В.* Профессиональные коммуникации библиотекарей в среде Web 2.0 / И. В. Юрик // Менеджмент вузовских библиотек. Роль библиотеки университета в формировании информационной культуры специалиста XXI века : материалы XII Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 12 – 14 окт. 2011 г. / Белорус. библ. ассоц., Белорус. гос. ун-т, Фундам. б-ка ; редкол.: П. М. Лапо (отв. ред.) [и др.] ; под науч. ред. А. В. Рубанова. – Минск : Изд. центр БГУ, 2012. – С. 193–200.

**Е. Э. Политевич,** *аспирант кафедры теории и истории информационно-документных коммуникаций, Белорусский государственный университет культуры и искусств*

# РЕАЛИЗАЦИЯ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ ФУНКЦИИ БИБЛИОТЕК УЧРЕЖДЕНИЙ ПРОФЕССИОНАЛЬНО-ТЕХНИЧЕСКОГО И СРЕДНЕГО СПЕЦИАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развитие непрерывного образования и инновационные технологии изменили возможности реализации образовательной функции, а также ставят перед библиотекарями качественно новую задачу: перейти от разрозненной, не систематической информационной подготовки к целенаправленному, систематическому обучению навыкам работы с информацией, что способствует формированию информационной компетентности учащихся, получению необходимых знаний и расширению их интересов.

Отсутствие в библиотековедческой литературе общепринятой типологии функций библиотек приводит к тому, что образовательная функция обозначается различными терминами («функция в помощь учебе», «общеобразовательная функция», «функция содействия образованию и воспитанию») и соотносится с различными группами функций (и с главными, основными, и с производными, прикладными).

К настоящему времени сформировано такое научное направление, как библиотечная педагогика, изучающая педагогический потенциал библиотек различных типов и видов, их вклад в самообразование и воспитание пользователя. В рамках